РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Калачова І.І.**, *выкладчык*

# ЭТНАПЕДАГАГІЧНАЯ СПАДЧЫНА І ЯЕ ВЫКАРЫСТАННЕ Ў ПРАЦЫ САЦЫЯЛЬНАГА ПЕДАГОГА З СЯМ'ЁЙ

Этнапедагагічная спадчына як частка культуры любога этнасу захоўвае шматвяковы вопыт народнага выхавання, вопыт, які ў творча перапрацаваным і адаптаваным да сучаснасці выглядзе можа быць важнейшай крыніцай сацыяльна-педагагічнай практыкі.

Беларусь - краіна, на тэрыторыі якой пражываюць прадстаўнікі розных нацыянальнасцей. Іх этнапедагагічная спадчына мае не толькі багацейшы нацыянальны змест, этнічную самабытнасць, але і глыбокую натуральнасць, гуманістычнасць, грунтоўнасць. Ведаць яе асаблівасці і формы

распаўсюджвання, рэгіёны бытавання і выкарыстання ў сучасным адукацыйна-выхаваўчым працэсе - важнейшая задача ў падрыхтоўцы сацыяльных педагогаў.

Этнапедагагічная спадчына ўплывае на фарміраванне лепшых якасцей асобы: патрыятызму, сумленнасці, вернасці і адданасці айчыне, працавітасці, маральнасці і інш.

Этнапедагагічная спадчына беларускага народа як частка культуры захоўвае народны выхаваўчы вопыт, які назапашваўся папярэднікамі. Погляд у мінулае высвятляе дасканалую сістэму сацыялізацыі, этнізацыі асобы, якая складвалася пад уплывам навуковай думкі, грамадскасці, навакольнага асяроддзя, сям'і. Дастаткова ўспомніць такіх этнографаў, фалькларыстаў, педагогаў, як Е.Р.Раманаў, М.Я.Нікіфароўскі, Ю.Ф.Крачкоўскі, У.М.Дабравольскі, Я.Ф.Карскі, П.В.Шэйн, М.В.Доўнар-Запольскі, А.Я.Багдановіч, І.Д.Гарбачэўскі і інш.

Сямейная этнапедагагічная спадчына беларускага народа з'яўляецца крыніцай ведаў аб выроціванні сем'яніна, працаўніка, патрыёта. Сямейныя этнапедагагічныя традыцыі беларусаў падзяляюцца на традыцыі працоўнага, маральнага, разумовага, эстэтычнага, патрыятычнага, фізічнага, рэлігійнага выхавання. Працоўная этнапедагагічная традыцыя з'яўляецца найгалоўнейшай у сістэме народнай педагогікі, яна адлюстроўвае менталітэт беларуса і ўплывае на фарміраванне іншых этнапедагагічных традыцый. маральнай, эстэтычнай, фізічнай, разумовай і г. д.

Далучаць сямейную этнапедагагічную спадчыну да сучасных псіхолага-педагагічных ведаў, якія набываюць сацыяльныя педагогі,- адна з задач кафедры педагогікі сацыякультурнай дзейнасці. Сярод іншых дысцыплін вылучаецца прадмет «Этнапедагогіка». Праз разнастайныя формы заняткаў студэнтам даносяцца асноўныя ідэі беларусаў аб сямейным выхаванні, тлумачыцца іх змест, вывучаецца сістэма іх дзейнасці. Першы вопыт выкладання прадмета «Этнапедагогіка» паказаў неабходнасць далейшага ўдасканалення і паглыблення зместу прадмета, практычную значнасць ведаў, набытых студэнтамі. З тэарэтычнага боку цікавасць у студэнтаў выклікаюць гістарычныя,



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

этнаграфічныя, фальклорныя пытанні этнічнай педагогікі, з практычнага - асабістае далучэнне студэнцкай моладзі да пытанняў, якія маюць важнейшае значэнне ў іх жыцці (напрыклад, вызначэнне радаводу, набыццё ведаў аб прыёмах, метадах і сродках выхавання дзяцей і інш.). Цікавасць выклікае і тэма вольнага часу сучаснай сям'і (магчымасці ўключэння народных прыёмаў арганізацыі вольнага часу ў святочнае і штодзённае жыццё).

Этнасацыялагічнае апытанне сучаснай сям'і г.Мінска, якое праводзілася намі на працягу 1992-1995 гг. з мэтай высвятлення ўзроўню этнапедагагічных ведаў, паказала, што бацькам патрэбна хуткая дапамога па разнастайных пытаннях сацыялізацыі дзяцей, падлеткаў, моладзі. Будучыя сацыяльныя педагогі могуць аказаць непасрэднае ўздзеянне на павышэнне агульнапедагагічнай і этнапедагагічнай культуры і адукаванасці бацькоў.

Як бачым, вывучэнне, засвойванне, выкарыстанне этнапедагагічнай спадчыны ў сістэме падрыхтоўкі сацыяльных педагогаў, арганізатараў вольнага часу ў сацыякультурнай сферы карысна, бо накіравана на ўмацаванне маральных устояў сям'і, яе дабрабыту, бацькоўскай культуры, на палягшэнне мікраклімату.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ